В. Г. Качан (*Мінск, Беларусь*)

# АБ ГРАМАТЫЦЫ НАВУКОВАЙ І ШКОЛЬНАЙ

Вынікі граматычных даследаванняў знаходзяць сваё адлюстраванне ў розных тыпах апісанняў. З аднаго боку, гэта апісанні асобных раздзелаў граматычнага ладу мовы, з другога – апісанне граматычнай сістэмы мовы ў цэлым, усіх яе раздзелаў (словаўтварэння, марфалогіі і сінтаксісу). Апош- нія могуць утрымліваць характарыстыку сінхроннага моўнага стану або аднаўляць гістарычную карціну развіцця граматычнага ладу мовы. Такія апісанні прадстаўленны ў розных тыпах граматык.

Традыцыйна выдзяляюць навуковыя граматыкі і школьныя. Мэта наву- ковай граматыкі (апісальнай, апісальна-нарматыўнай, тэарэтычнай) – апі- саць граматычны лад мовы на аснове найбольш дасканалых метадаў дасле- давання. Калі апісальная граматыка паслядоўна і поўна характарызуе ўсе (або асноўныя) рысы граматычнага ладу мовы, то апісальна-нарматыўнапаралельна з апісаннем уводзіць правілы выкарыстання ў маўленні грама- тычных форм, сінтаксічных канструкцый, суправаджаючы гэтую інфарма- цыю стылістычнай характарыстыкай. Выпадкі памылковага (няправіль- нага) выкарыстання граматычных форм і канструкцый у такія граматыкі не ўключаюцца. Для сучаснага беларускага мовазнаўства прыкладам апі- сальна-нарматыўнай граматыкі можа служыць «Беларуская граматыка» ў 2 частках пад рэдакцыяй акадэміка АН БССР М. В. Бірылы і доктара фі- лалагічных навук П. П. Шубы, падрыхтаваная ў Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР. Да навуковых апісальных граматык адносіцца і параўнальна-гістарычная граматыка, якая даследуе граматычны лад род- насных моў у іх развіцці або на пэўным этапе развіцця, і супастаўляльная (у тым ліку кантрастыўная), якая апісвае аднолькавыя або адрознівальныя рысы ў роднасных або няроднасных мовах на пэўным этапе іх развіцця. У адрозненне ад апісальнай і апісальна-нарматыўнай, тэарэтычная грама- тыка аддае сваю ўвагу складаным і не вырашаным да канца праблемам гра- матычнай навукі.

Усе навуковыя апісальныя граматыкі ў залежнасці ад таго, што пакла- дзена ў іх аснову, па сутнасці дзеляцца на фармальныя (або пасіўныя) і функцыянальныя (або актыўныя). Можна сказаць, што фармальная і функ- цыянальная граматыкі – гэта два розныя падыходы да вывучэння аднаго і таго ж аб’екта. У фармальнай (пасіўнай) граматыцы апісанне вядзецца ад формы да значэння, у функцыянальнай – ад значэння да формы яго выра- жэння. Фармальнымі з’яўляюцца ўсе вядомыя апісальныя і апісальна-нар- матыўныя граматыкі беларускай і рускай

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

моў, у якіх прадстаўлены сістэ- мы фармальных сродкаў на ўсіх граматычных узроўнях – словаўтварэння, марфалогіі і сінтаксісу. Пры гэтым граматычныя значэнні і сінтаксічная се- мантыка апісваюцца з рознай ступенню глыбіні і дэталізацыі, даследаванне зводзіцца да ўказання структурных тыпаў, а значэнне ўказваецца па ходу апісання кожнага тыпу і ўстанаўліваецца яно часцей за ўсё пры дапамозе інтуіцыі.

У беларускім мовазнаўстве больш даследаванымі ў граматыцы з’яўля- юцца словаўтваральны і марфалагічны аспекты, а сінтаксічны аспект і сён- ня патрабуе ўсебаковага тэарэтычнага і практычнага разгляду. У апошнія дзесяцігоддзі мовазнаўствам распрацаваны асноўныя палажэнні і метады семантыка-структурнага (ад значэння да формы) апісання сінтаксічных адзінак, дадзена азначэнне самога аб’екта даследавання (што такое сінтак- січная семантыка), вызначаны асноўныя метады даследавання (метад ды- ферэнцыяльных семантычных прыкмет, сістэма бінарных апазіцый), што дазволіла даць сістэмнае апісанне функцыянальна-семантычных катэгорый (ФСК) [1].

Перавага функцыянальна-семантычнага прынцыпу апісання сінтак- січных адзінак (такую назву ў навуковай літаратуры атрымаў прынцып «ад значэння да формы») відавочная: змяншаецца колькасць даследуемых аб’ектаў апісання і класіфікацыі (гэта важна, у першую чаргу, з метадала- гічнага боку); з’яўляецца магчымасць на аснове лексіка-граматычнай ха- рактарыстыкі структурных кампанентаў сінтаксічных адзінак дэтальна прааналізаваць сінтаксічныя канструкцыі, якія выражаюць адзін тып се- мантыка-сінтаксічных адносін, г.зн. раскрыць семантычныя якасці сінтак- січных адзінак, асаблівасці іх структуры, правілы пабудовы, узаемасувязь іх семантычнай і структурнай арганізацыі; указаць на ўмовы функцыяна- вання гэтых семантычных канструкцый, устанавіць іх семантычную кла- сіфікацыю, вызначыць аб’ём лексікі, якая ўдзельнічае ў выражэнні пэўных семантыка-сінтаксічных адносін, і, самае галоўнае, выявіць сістэму роз- наўзроўневых спосабаў і сродкаў іх перадачы ва ўсіх стылях літаратурнай мовы. Семантычны аналіз сінтаксічных адзінак, якія рэалізуюць адзін тып адносін, служыць сэнсавым службовым інвентаром, неабходным для таго, каб распазнаць, выбраць неабходныя сінтаксічныя канстукцыі з ліку тых, якімі валодае мова.

Ва ўмовах семантызацыі сінтасісу, ва ўмовах пераарыентацыі граматыч- ных апісанняў з прынцыпу «ад формы да значэння» на прынцып «ад зна- чэння да формы» стала магчымым сістэмнае апісанне сінтаксісу, дзякуючы таму, што ў сучасным мовазнаўстве распрацаваны дасканалыя метады і па- дыходы да вывучэння граматычнага ладу

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

канкрэтнай мовы. Праблема апі- сання сінтаксічнай семантыкі стала ў апошні час адной з самых актуальных і перспектыўных у сучаснай лінгвістычнай тэорыі і практыцы. Семантычны аспект даследавання граматычнага ладу мовы (сінтаксічная семантыка цес- на звязана з падсістэмамі лексікі і марфалогіі, разам з імі ўдзельнічае ў ар- ганізацыі сістэмы мовы) заўсёды цікавіў лінгвістаў, і неабходна адзначыць, што гэтае пытанне ставілася і вырашалася па-рознаму. Сёння любое граматычнае апісанне, за рэдкім выключэннем, абавязкова ўключае семантычнае даследаванне і носіць функцыянальны характар. Падыходы і метады дасле- давання ў функцыянальных граматыках могуць быць самымі разнастайны- мі: гэта і апісанне ўласнамоўных функцый (намінатыўнай, інфармацыйнай, валюнтатыўнай, эмацыйнай і камунікатыўнай) і сродкаў іх рэалізацыі; апі- санне функцыянальна-семантычных катэгорый і рознаўзроўневых адзінак іх рэалізацыі, іншымі словамі, апісанне семантычнага інварыянта і сродкаў яго выражэння і інш. Найбольш канструктыўнымі з'яўляюцца падыходы, якія не адмяжоўваюць апісанне граматычных законаў і правілаў ад іх пастаяннага ўзаемадзеяння з законамі і правіламі ўсёй сістэмнай арганізацыі мовы.

Што датычыцца генератыўнай і прапазітыўнай граматык, атрымаўшых ў свой час шырокі рэзананс, то і яны саступілі месца граматыцы функцыя- нальнай.

Школьная граматыка, па логіцы, павінна так, як і навуковая граматыка, утрымліваць адпаведны аб'ём існуючых у навуковых апісальна-нарма- тыўных граматыках лінгвістычных палажэнняў. Аднак гэта не так, і часта школьная граматыка проціпастаўляецца навуковай і знаходзіцца іншы раз у поўным разрыве з ёй. Акадэмічная апісальна-нарматыўная граматыка рыхтуецца, падтрымліваецца, адабраецца калектывам вядучых лінгвістаў і з'яўляецца крыніцай «сістэматычнага вывучэння», «даведачным дапамож- нікам па асобных канкрэтных пытаннях» [2]. Узнікае пытанне, чаму тады школьная граматыка, якая і павінна выконваць гэтыя функцыі, стаіць так далёка ад навуковай. Відаць, з гэтай прычыны і ў школьных падручніках так многа недакладнасцей і спрэчных пытанняў, а якраз школьная граматыка і павінна стаць асновай для напісання школьнага падручніка. Іншы раз аўтар падручніка не ведае, як даць тое ці іншае граматычнае азначэнне, як сфар- муляваць правіла, у якім аб'ёме, у якой паслядоўнасці падаць граматычны матэрыял. Школьны ж настаўнік не можа растлумачыць шасцікласніку ў прапанаваным у падручніку практыкаванні на адпрацоўку пастаноўкі пра- цяжніка паміж дзейнікам і выказнікам, чаму

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ў адным сказе назоўнік вы- конвае функцыю прызвязачнага члена састаўнога іменнага выказніка разам з азначэннем (дапасаваным ці недапасаваным, якое да яго адносіцца), а ў другім выпадку азначэнне не ўключаецца ў структуру выказніка (у прак- тыкаванні неабходна было не толькі паставіць працяжнік, дзе трэба, паміж дзейнікам і выказнікам, але і разабраць сказы па членах сказа). І такіх пра- блем дастаткова многа. І такія праблемы павінна вырашаць школьная гра- матыка, асноўныя палажэнні якой і стануць асновай школьных падручнікаў. Безумоўна, застаецца адкрытым пытанне аб аб'ёме школьнай граматыкі, але існуюць вучэбныя праграмы, а граматычныя палажэнні можна звесці да аднага варыянта.

Як апісальна-нарматыўная, так і школьная граматыкі – гэта практычныя граматыкі. «Беларуская граматыка для школ» Браніслава Адамавіча Тараш- кевіча, аднаго з заснавальнікаў Таварыства беларускай школы, выкладчыка беларускай і грэчаскай моў у Мінскім педагагічным інстытуце, адыграла значную ролю не толькі ў станаўленні беларускай літаратурнай мовы, але і ў пашырэнні асветы на Беларусі. Падручнікі па беларускай мове так і на- зываліся раней: «Практычная граматыка беларускай мовы» (1921 г.), «Бела- руская мова. Пачатковая граматыка» (1924 г.) Язэпа Юр'евіча Лёсіка, які на працягу 1921–1930 гг. выкладаў у БДУ.

Цікава, што ў некаторых лексікаграфічных выданнях слова *граматыка* тлумачыцца не толькі як «лад мовы, які разам з фанетыкай і лексікай утва- рае яе цэласную сістэму», «навука аб гэтым ладзе», «сістэма моўных форм, спосабаў словаўтварэння, сінтаксічных канструкцый, якія ўтвараюць асно- ву для камунікацыі», «раздзел мовазнаўства, які вывучае будову слова і ска- за», «сукупнасць норм змяненняў слоў і спалучэння іх у сказы», але і «*кніга*, якая апісвае граматычны лад мовы», «*кніга*, у якой змешчаны правілы сло- вазмянення і спалучэння слоў у сказы», «*вучэбная кніга*, у якой выклада- юцца асновы (правілы) якой-небудзь мовы». Дарэчы, у «Англа-беларускім слоўніку» Валянціны Пашкевіч слова grammar тлумачыцца як 1) граматыка і 2) асновы і прыводзяцца прыклады: grammar school – 1) пачатковая школа, 2) Брытанская сярэдняя школа класічнага тыпу.

«Беларуска-расійскі (Вялікалітоўска-расійскі) слоўнік» д-ра Я. Стан- кевіча, выдадзены Вялікалітоўскім (беларускім) Фондам імя Льва Сапегі, са спасылкай на «Очерки простонародного житья-бытья Витебской Бело- руссии» М. Нікіфароўскага (Віцебск, 1895) дае наступнае значэнне слова *грамма* – мы, общ. 1. – свидетельский

источник в лице старожила, знато- ка давних событий и времени, 2. старожил; а ў асобным артыкуле *жывая грамма* – живое пока-что лицо, свидетель событий, на авторитет которого можно полагаться.

Ды і само слова *граматыка* першапачаткова мела значэнне «майстэрст- ва чытаць і пісаць літары» (ад грэч. gramma – літара, напісанне).

**Літаратура**


1. Качан, В. Г. Сінтаксічная катэгорыя мэты і спосабы яе выражэння ў су- часнай беларускай літаратурнай мове / АН БССР. Ін-т мовазнаўства імя Якуба Коласа. Аўтарэферат на саісканне вучонай ступені кандыдата філалагічных на- вук. – Мінск, 1989.
2. Беларуская граматыка: У 2-х ч. Ч. 2. Сінтаксіс / АН БССР. Ін-т мовазнаўст- ва імя Якуба Коласа ; рэд. М. В. Бірыла, П. П. Шуба. – Мінск : Навука і тэхніка, 1986.
3. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы: Больш за 65 000 слоў / пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко. – 2-е выд. – Мінск : БелЭн, 1999.
4. Булыка, А. М. Слоўнік іншамоўных слоў. – Мінск : Народная асвета, 1993.
5. Словарь русского языка: в 4-х томах / АН СССР, Ин-т рус. яз. ; под ред. А. П. Евгеньевой. – 2-е изд., исправленное и дополненное – М. : Русский язык, 1981.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ